# Рук мора шуміць

Гімн СДМ у Лісабоне (2023)

Сл.: *Жуан Паўлу Ваз* (пер. П. Бранаўца)    Муз.: *Пэдру Фэрэйра, Карлуш Гарсія*

**fis$^7$                    E**
***1.*** Шляхам розным крочым з розных мясцін,
**A     H          A      H**
каб разам далей крочыць шляхам адным,
**fis$^7$              E**
каб з Марыяй верна «так» усклікаць.
**fis$^7$    E     A    H     A     Cis**
Вось мы, Твае слугі, будзь воля Твая, Ойча наш, Ойча наш!
**fis$^7$    E    A    H    A    Cis**
Нас кліча Хрыстос, нас Езус вядзе, каб шукаць, каб даваць,
**fis$^7$   E   A   H**
адважнае «так», як Маці, казаць.

**E              H**
***Рэф.:*** Кожны хай пачуе голас наш,
**A      H    A     H**
хай рук нашых мора ў паветры шуміць.
**E              H**
Езус – Бог жывы, Ён любіць нас –
**A     H      E**
і мы будзем жыць, каб любіць.

**2.** Ты, што шлях уласны хочаш знайсці,
прыйдзі, каб убачыць, што бачылі мы.
З намі крочы, шукай адважна адказ,
што ўзносіць твой лёс, што ў ім гасіць усмешку тваю і любоў.
Назад не глядзі і «не» не кажы, сэрца голас прымі,
без страху сваёй дарогай ідзі. ***Рэф.***

***3.*** Вось Марыя першай цуд прыняла –
яе захапіў дар жыцця без канца.
Так і я з даверам прагну прыняць
Хрыста таямніцу – Ён тут назаўжды сярод нас, сярод нас.
Маўчаць не магу і ўсцяж не ўсклікаць: «Пане мой, я ўвесь Твой!
Пайду за Табой, не буду маўчаць». ***Рэф.***

**fis$^7$          E**
***4.*** Без сумневаў у дарозе сваёй
**A    H    A    H    fis$^7$**
дзяўчына Марыя ў дні тыя пайсці паспяшыла
**H**
ў край горны з дому свайго
**fis$^7$   E        A     H      A   Cis**
Альжбету наведаць, быць разам, пачуць прывітанне яе:
**fis$^7$     E      A     H      A     Cis**
«Твой плод блаславёны – мой Пан і мой Бог!» Кожны прагне пачуць:
**fis$^7$   E   A    H**
«Паверыўшы Пану, навек шчасны будзь!» ***Рэф.***